УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Праэктар па вучэбнай рабоце
А.В.Макоўчык
« 21 » 06 2023 г.

Рэгістрацыйны № УД 311-44/2023/уч.

# УВОДЗІНЫ Ў ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя**
**(Беларуская мова і літаратура);**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя**
**(Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы))**

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0113-02-2023 (__.__.____, №____), вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указанием мовы))

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

А.І.Лугоўскі, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

І.М.Мішчанчук, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

М.С.Рак, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Г.К.Тычко, прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», доктар філалагічных навук, прафесар;

П.У.Чайка, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры моваэнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», прафесар

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар
ДУА «Гімназія № 43 г. Мінска» ________ М.Ф.Кавалеўская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 ад 21.03.2023 г.)

Загадчык кафедры ________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 6 ад 21-06. 2023 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ ________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Уводзіны ў літаратуразнаўства» прызначана для студэнтаў установы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», якія навучаюцца па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)), з'яўляецца дысцыплінай модуля «Асновы літаратурнай адукацыі» і ўваходзіць у сістэму літаратуразнаўчай падрыхтоўкі студэнтаў 1 курса філалагічнага факультэта.

Вучэбная дысцыпліна «Уводзіны ў літаратуразнаўства» вывучаецца ў першым семестры першага года навучання ва ўстанове вышэйшай адукацыі і мае прапедэўтычную накіраванасць.

***Мэтай*** вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства» з'яўляецца стварэнне неабходнай асновы для засваення студэнтамі літаратуразнаўчых дысцыплін, якія ўваходзяць у вучэбны план.

***Задачы*** вучэбнай дысцыпліны:

– садзейнічаць фарміраванню комплексу паняццяў пра літаратуру як мастацкую з'яву і форму грамадскай свядомасці;

– выпрацоўваць уменні навуковага аналізу твораў, вызначэння іх тэмы, ідэі, праблематыкі, раскрыцця сувязі творчасці пісьменніка з яго светапоглядам;

– навучыць вызначаць моўна-выяўленчыя сродкі, сістэмы вершаскладання, рытм, рыфму, страфу, а таксама род і асноўныя жанры мастацкіх твораў;

– праводзіць работу па актывізацыі цікаўнасці будучых педагогаў да навінак літаратуры, на якія апіраецца выкладчык пры чытанні дысцыпліны.

***Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.*** Згодна з вучэбнымі планамі па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)) вучэбная дысцыпліна «Уводзіны ў літаратуразнаўства» ўваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі. Вучэбная дысцыпліна «Уводзіны ў літаратуразнаўства» звязана з вучэбнай дысцыплінай «Гісторыя беларускай літаратуры XI–XVI стагоддзяў», якая ўваходзіць у дзяржаўны кампанент, і вучэбнымі дысцыплінамі «Вусная народная творчасць», «Беларуская дзіцячая літаратура», якія ўваходзяць у кампанент установы вышэйшай адукацыі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыялізаванай кампетэнцыі СК-1: Аналізаваць, сістэматызаваць і класіфікаваць базавыя літаратуразнаўчыя паняцці і факты.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства» студэнт павінен ***ведаць:***

– сутнасць і спецыфіку літаратуры;

– структуру мастацкага твора

– асноўныя мастацкія метады і літаратурныя напрамкі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства» студэнт павінен ***умець:***

– вызначаць родавую і жанравую спецыфіку мастацкіх твораў, іх ідэйна-тэматычную скіраванасць;

– характарызаваць сістэму вобразаў у творы;
– вызначаць моўныя выяўленчыя сродкі (лексічныя, сінтаксічныя, фанетычныя і інш.);
– аперыраваць тэхнікай вершаскладання;
– вызначаць, да якога метаду ці напрамку адносіцца творчасць пісьменніка;
– рабіць цэласны аналіз літаратурнага твора.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства» студэнт павінен ***валодаць:***

– агульнай літаратуразнаўчай тэрміналогіяй, здольнасцю кваліфікавана будаваць выказванне пра літаратуразнаўчыя з'вы;
– навыкамі абагульнення і сістэматызацыі вывучанага, вылучэння галоўнага, істотнага, бачання адметнага пры параўнанні розных літаратурных твораў;
– асноўнымі падыходамі да аналізу літаратуразнаўчых катэгорый ў мастацкім тэксце.

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дадзенай дысцыпліны пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы). Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў кампетэнцыі СК-1 выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Асноўнымі тэхналогіямі навучання з'яўляюцца: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія, а таксама тэхналогіі дыстанцыйнага навучання.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Уводзіны ў літаратуразнаўства» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

***Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў.*** Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства» выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках пад кантролем выкладчыка, выкананне індывідуальных заданняў пазааўдыторна (самастойная работа студэнтаў), напісанне рэфератаў, падрыхтоўка дакладаў для выступлення на студэнцкіх навуковых канферэнцыях і інш.

***Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, форма прамежкавай атэстацыі.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства» на 1 курсе (спецыяльнасць 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)) разлічана на 108 гадзін на 1 курсе ў 1 семесты.. З іх 48 аўдыторных гадзін: 24 лекцыйных і 24 практычных. Форма адукацыі – дзённая. Форма кантролю – экзамен (І семестр).

Усяго гадзін па праграме 108, з іх аўдыторных 48, лекцыйныя – 24 гадзіны, практычныя – 24 гадзіны.

| Семестр | Усяго | Лекцыйныя | Практычныя | Самастойная работа студэнтаў | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| I | 108 | 24 | 24 | 60 | Экзамен |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Агульныя праблемы літаратуразнаўства

### *1.1 Літаратуразнаўства як навука*

Асноўныя раздзелы літаратуразнаўства. Гісторыя літаратуры, яе суадносіны з гісторыяй цывілізацый. Тэорыя літаратуры. Тэорыя літаратуры і метадалогія. Паэтыка як літаратуразнаўчая дысцыпліна і як сістэма вобразнага адлюстравання свету. Паэтыка агульная, гістарычная, функцыянальная, параўнальная, нарматыўная, практычная і інш. Літаратурная крытыка. Асоба крытыка.

Літаратуразнаўства і іншыя навуковыя дысцыпліны*:* эстэтыка (распрацоўка тэарэтычных праблем мастацтва), філасофія (філасофія – эстэтыка – тэорыя літаратуры – гісторыя літаратуры – літаратурная крытыка), гісторыя (сацыякультурны кантэкст), псіхалогія (унутраны свет, псіхалогія мастацкай творчасці), эканоміка (знешнія фактары развіцця літаратурнага працэсу), тэалогія (біблейная аснова твораў), сацыялогія, герменеўтыка, этыка, матэматыка і кібернетыка (напісанне вершаў з дапамогай ЭВМ, статыстычныя падлікі з дапамогай камп’ютараў, машынны пераклад тэксту).

Дапаможныя літаратуразнаўчыя дысцыпліны*:* тэксталогія і яе адгалінаванні (палеаграфія, дыпламатыка, сфрагістыка, атрыбуцыя), гістарыяграфія, бібліятэказнаўства.

Сумежныя дысцыпліны: фалькларыстыка, этнаграфія, літаратурнае краязнаўства, кнігазнаўства, бібліятэказнаўства, музеязнаўства.

### *1.2 Спецыфіка мастацкай літаратуры*

Віды пазнання: навуковае і мастацка-эстэтычнае, іх мэты і сродкі. Паняцце аб прыгожым. Паняцце аб эстэтычным ідэале. Суадносіны аб’ектыўнага і суб’ектыўнага. Мастацкі вобраз як форма адлюстравання рэчаіснасці мастацтвам, «канкрэтная і той самы час абагульненая карціна жыцця людзей, створаная з дапамогаю вымыслу і якая мае эстэтычнае значэнне» (Л. Цімафееў).

Тыпы мастацтва па спосабу адлюстравання рэчаіснасці: прасторавы, часавы, сінтэтычны.

Літаратура як від мастацтва. Прадмет літаратуры. Месца мастацкай літаратуры ў гісторыка-культурным кантэксце. Літаратура і іншыя віды мастацтва (выяўленчае мастацтва, музыка). Падзел літаратуры паводле характару вобразнага адлюстравання на мастацкую, публіцыстычную, дакументальную, дыдактычную, эпісталярную. Падзел літаратуры на прозу, паэзію і драматургію. Дзіцячая літаратура. Масавая літаратура. Нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры. Грамадзянскасць літаратуры. Тэорыя «чыстага мастацтва», або «мастацтва для мастацтва». Герметызм як супрацьлегласць грамадзянскасці. Літаратура і гуманізм. Мастацкі пераклад як від творчасці. Віды мастацкага перакладу: аўтарскі, аўтарызаваны, паслоўны, падрадковы, вольны, дакладны.

Функцыі літаратуры: эстэтычная, выхаваўчая, пазнавальная, камунікатыўная, геданічная.

### *1.3 Праблема аўтара*

Формы прысутнасці аўтара ў творы. Аўтар біяграфічны як асоба па-за мастацкім творам, у гістарычнай рэальнасці.Невядомы аўтар у славеснасці розных народаў (аэд, бард, жанглёр, шпільман, музы'ка і інш.). Аўтар-стваральнік, дэміург, майстар, «эстэтычна дзеючы суб’ект» (Бахцін). Імпліцытны (абстрактны) аўтар.

Эксплiцытны (драматызаваны) аўтар. Наратар (драматызаваны апавядальнiк). Паняцце пра лiрычнага героя. Уяўны апавядальнiк.

Творчая лабараторыя пiсьменнiка.Псiхалогiя творчасцi. Рэчаiснасць i асоба пiсьменнiка. Передумовы творчага працэсу. Талент. Натхненне. Назiранне. Уяўленне. Iнтуiцыя. Этапы творчага працэсу: узнiкненне творчай задумы, падрыхтоўчы этап, напiсанне твора, апрацоўка i перапрацоўка тэксту.

## Тэма 2. Лiтаратурны твор

### *2.1 Цэласнасць i структура лiтаратурнага твора*

Паняцце пра твор i тэкст. Падтэкст, кантэкст, генатэкст, iнтэртэкст, звыштэкст, метатэкст. Паняцце пра рамачны (дадатковы, пабочны) тэкст. Рамачныя кампаненты тэксту. Асноўны тэкст i яго прыкметы.

Змест i форма як фiласофска-эстэтычныя, лiтаратуразнаўчыя катэгорыi. Структура твора i яго фармальна-змястоўныя кампаненты (канцэптуальны ўзровень, узроўнi арганiзацыi твора як мастацкага цэлага, «унутранай формы» i знешняй формы, паводле М. Мешчараковай). Адзiнства формы i зместу. Паняцце аб змястоўнасцi формы. Сутнасць фармалiзму i вульгарнага сацыялагiзму ў мастацкай лiтаратуры.

### *2.2 Канцэптуальны ўзровень лiтаратурнага твора*

Тэматыка, праблематыка, iдэя, пафас. Вiды тэм у дачыненнi да рэальнасцi (актуальныя, гiстарычныя, агульначалавечыя, «вечныя»). Iдэя – асноўная абагульняльная думка ў творы. Iнтэрпрэтацыя мастацкага вымыслу, магчымасцi яго неадназначнага разумення. Iдэя аб’ектыўная i аўтарская. Сувязь тэмы з мастацкай iдэяй i праблематыкай твора. Сукупнасць праблем i iх месца ў творы (галоўная, другасная): фiласофскiя, сацыяльна-палiтычныя, маральна-этычныя, нацыянальна-гiстарычныя. Паняцце аб тэндэнцыйнасцi лiтаратуры. Пафас i яго вiды (гераiчны, трагiчны, драматычны, рамантычны, сатырычны, камiчны).

### *2.3 Узровень арганiзацыi твора як мастацкага цэлага*

Сюжэт, канфлiкт, кампазiцыя. Сюжэт у сiстэме мастацкага твора. Разнавiднасцi лiтаратурных сюжэтаў: сюжэты, пабудаваныя на рэальнай жыццёвай аснове, выдуманыя сюжэты, запазычаныя сюжэты. Вандроўныя (традыцыйныя, класiчныя) сюжэты. Асноўныя элементы сюжэта i iх значэнне ў творы. Хранiкальная i канцэнтрычная пабудова сюжэтаў. Сюжэтныя лiнii ў вялiкiм мастацкiм творы. Сюжэт i канфлiкт. Канфлiкт – рухаючая сiла развiцця сюжэту. Вiды канфлiктаў: сацыяльны, псiхалагiчны (знешнi i ўнутраны), сямейна-бытавы i iнш. Сутнасць «тэорыi» бесканфлiктнасцi ў мастацкай лiтаратуры. Асаблiвасцi канфлiкту ў драматычных творах. Сюжэт i фабула: агульнае i адметнае. Залежнасць сюжэта ад родавай i жанравай спецыфiкi твора. Адметнасць сюжэта ў лiрыцы. Сюжэтныя i пазасюжэтныя элементы, iх суразмернасць i ўзаемадзеянне.

Кампазiцыя як спосаб арганiзацыi мастацкага матэрыялу у творы. Паняцце пра архiтэктонiку. Рэтраспекцыя, iнверсiя. Мастацкае адзiнства твораў, аб’яднаных агульнай задумай, тэмай, iдэяй, вобразамi. Сiстэма персанажаў. Пейзаж, iнтэр’ер, мастацкая дэталь як элементы кампазiцыi. Асаблiвасцi лiрычнай кампазiцыi: амебейная, анафарычная, кальцавая, ланцуговая кампазiцыя. Пункт гледжання ў творы i яго планы.

***2.4 Мастацкі свет літаратурнага твора (узровень «унутранай формы») і яго структура***

Вобразны свет твора. Паняцце пра аб’ект і суб’ект адлюстравання. Віды вобразаў: па прадмету адлюстравання (вобразы людзей, жывёл, пейзаж, інтэр’ер, падзеі), эстэтычнай афарбоўцы (прыгожае, узвышанае, трагічнае, камічнае), ступені абагульнення (агульначалавечае, нацыянальнае). Вобраз і знак (матэрыяльны прадмет як прадстаўнік і наменснік іншага прадмета). Паняцце пра архетып.

Спосабы характарыстыкі вобраза-персанажа, сродкі яго стварэння. Паняцці «персанаж – характар – тып». Прыёмы стварэння персанажаў. Партрэт. Сістэма персанажаў у творы. Тыпалогія персанажаў. Антыгерой у літаратуры. Прадметны свет твора. Пейзаж і яго мастацкія функцыі. Віды пейзажу. Рэч. Інтэр’ер як сродак характарыстыкі персанажа. Інтэр’ер у структуры сюжэта.

Мастацкая дэталь і яе віды.

Час і прастора ў творы. Хранатоп (па М.Бахціну) і віды мастацкага часу і мастацкай прасторы. Суб’ект адлюстравання (лірычны суб’ект, вобраз аўтара, апавядальнік у творы).

***2.5 Узровень знешняй формы мастацкага твора. Мова мастацкай літаратуры***

Мова мастацкай літаратуры з пункту гледжання гісторыі і тэорыі. Мова народная, літаратурная і мова мастацкай літаратуры. Выяўленчыя, выяўленча-выразныя сродкі ў літаратуры. Іх мастацкія функцыі.

Паэтычная лексіка і яе асаблівасці. Роля слоўнікавага складу ў стварэнні мастацкага вобраза. Мастацкая мова з пункту гледжання яе функцыянальных (кніжная, размоўная, мова радыё і кіно, публічная мова) і экспрэсіўных (афіцыйная, урачыстая, інтымная, насмешлівая, фаміль’ярная) разнавіднасцей. Мастацкая мова з пункту гледжання яе паходжання і сферы ўжывання (архаізмы, гістарызмы, дыялектызмы, прафесіяналізмы, жарганізмы і г.д.). Макаранічная мова. Эўфемізмы. Паняцці пра сінанімію, полісемію. Выкарыстанне пісьменнікам антонімаў і амонімаў.

Троп: вызначэнне паняцця. Класіфікацыя тропаў. Тропы аўтарскія і агульнамоўныя. Простыя тропы (параўнанне, эпітэт) і іх выкарыстанне ў літаратуры. Складаныя тропы (метафара, метанімія, сімвал, алегорыя, гіпербала, літота і інш.). Іх мастацкая функцыя ў творы.

Паэтычны сінтаксіс. Стылістычныя (сінтаксічныя, інтанацыйныя) фігуры. Паўторы і віды паўтораў (анафара, эпіфара, кальцо, стык, бяззлучнікавасць, шматзлучнікавасць і інш.). Віды і формы парушэння сувязі паміж словамі (інверсія, анакалуф, эліпсіс і інш.). Рытарычныя фігуры (рытарычны зваротак, рытарычнае пытанне і інш.). Градацыя. Фразеалагізмы. Паняцці пра тэмпарытм і колан.

Паэтычная фанетыка (эўфоніка). Рытм. Рыфма. Гукапіс. Алітэрацыя. Асананс. Дысананс. Анафара. Эпіфара. Гукаперайманне. Паранімія.

## Тэма 3. Вершазнаўства

***3.1 Віды мастацкага слова***

Два віды мастацкага слова. Адрозненне паэзіі ад прозы. Вершазнаўства як галіна літаратуразнаўчай навукі. Яго асноўныя раздзелы. Адрозненне паэзіі ад проста верша. Структурна-змястоўнае адзінства верша. Паняцці пра вершаваны рытм, метр, вершаваны памер.

***3.2 Сістэмы вершаскладання***

Антычнае (метрычнае) вершаскладанне і яго асноўныя памеры (гекзаметр, пентаметр). Традыцыі антычнай сістэмы вершаскладання ў еўрапейскай, у т.л. беларускай, літаратуры.

Сілабічнае вершаскладанне (сілабіка). Сілабічны верш у славеснасці розных народаў. Выкарыстанне сілабічнага верша ў жанрах пасланняў, прадмоў, у творчасці С. Полацкага і інш.

Танічнае вершаскладанне (тоніка). Паходжанне ад народна-паэтычнай традыцыі. Роля перакладной літаратуры. Паняцце «танічны верш» (дольнік, тактавік, акцэнтны верш).

***3.3 Сілаба-танічнае вершаскладанне***

Паняцце пра памер і стапу і яе мадыфікацыі. Рытмічныя вызначэнні верша. Метр. Вершаваны памер. Паўза. Клаўзула. Гукавыя паўторы.

Паняцце пра рыфму і яе віды (па складоваму саставу, па сугучнасці, па размяшчэнні ў радках страфы). Рыфма канцавая, унутраная і пачатковая. Рэдкая рыфма. Экзатычная рыфма. Банальная рыфма. Спосабы рыфмоўкі. Белы верш.

Верлібр (свабодны верш).

***3.4 Страфіка***

Страфіка як раздзел вершазнаўства і як сукупнасць строф. Віды строф. Простыя віды: двухрадкоўі, трохрадкоўі і інш. Класічныя (складаныя) віды строф: (ад шасці да шаснаццаці радкоў). Цвёрдыя страфічныя формы (санет, трыялет, секстына, тэрцыны, актава, рандэль, рандо, анегінская страфа, хоку, танка і інш.). Вянок санетаў. Вянок вянкоў санетаў. Вольная страфа.

## Тэма 4. Літаратурныя роды, віды і жанры

***4.1 Літаратурныя роды***

Літаратурны родяк спосаб вобразнага адлюстравання рэчаіснасці. Тры роды мастацкай літаратуры: дыскусійнасць пытання. Іх адрозненні па мэтах, прадмету і форме адлюстравання, па адносінах аўтара да пераствoранага ім. Змест і функцыі родаў літаратуры. Узаемапранікненне эпасу, лірыкі і драмы. Формы адлюстравання рэчаіснасці: апавяданне (яго падзейныя і непадзейныя элементы), прамая мова персанажаў (маналог, дыялог). Эпас як аповед пра мінулае, гістарычнае і міфалагічнае. Паняцце пра лірычны род. Спецыфіка бессюжэтнай прозы. Драматычны род і яго агульная характарыстыка.

Паэзія і проза: агульнае і падобнае (спецыфіка і форма адлюстравання свету і яго прадмет, сюжэтна-кампазіцыйная будова твораў, іх вобразны свет, мастацкая мова).

***4.2 Літаратурныя віды і жанры***

Паняцце пра літаратурны від як унутрыродавую і міжродавую катэгорыю.

Жанр – «гістарычна складзены тып літаратурнага твора», «форма праяўлення літаратурных родаў і відаў». Яго тыпалагічныя ўласцівасці. Паняцці пра жаравы змест і жанравую форму.

Асноўныя літаратурныя віды і жанры.

У лірыцы: філасофска-медытатыўныя творы (медытацыя, пасланне, стансы, ямбы, філасофскі верш), велічальныя (гімн, ода, дыфірамб, панегірык, мадрыгал, эпітафія, эпіталама), песенныя (раманс, песня, серэнада, марш, баркарола),

сатырычныя (эпіграма, пародыя, інвектыва, сатыра). Лірыка грамадзянская, філасофская, пейзажная, інтымная.

У эпасе: эпапея, раман (рыцарскі, пастаральны, махлярскі, сацыяльна-псіхалагічны, сямейна-бытавы, гістарычны, прыгодніцкі, дэтэктыўны, навукова-фантастычны), аповесць, апавяданне, гумарэска, нарыс, фельетон, памфлет.

У драме: трагедыя, камедыя (сацыяльна-бытавая, сатырычная, лірычная), драма (сацыяльна-псіхалагічная, гераічная, лірычная, сацыяльна-бытавая), трагікамедыя.

Жанры ліра-эпічныя (балада, паэма, версет) і ліра-драматычныя (байка, драматычная паэма).

## Тэма 5. Літаратурны працэс

### *5.1 Літаратурны працэс і яго асноўныя заканамернасці*

Паняцце пра літаратурны працэс. Заканамернасці літаратурна-мастацкага развіцця. Сувязь літаратурнага працэсу з грамадска-палітычнымі абставінамі ў краіне, з эстэтычнымі ідэаламі пэўнага гістарычнага перыяду, з распацаванасцю літаратурнай мовы. Умовы ўзнікнення літаратурнага працэсу. Асноўныя прыкметы літаратурнага працэсу: масавасць і бесперапыннасць літаратурных з’яў і фактаў, пісьменніцкія ўзаемасувязі і ўзаемаўплывы, пераемнасць і развіццё літаратурных традыцый. Традыцыі і наватарства. Паняцце аб паскораным развіцці літаратуры.

Літаратурны працэс на Беларусі.

### *5.2 Мастацкі метад і стыль. Літаратурны напрамак*

Мастацкі (творчы) метад як сукупнасць прынцыпаў ідэйна-мастацкага пазнання і вобразнага адлюстравання рэчаіснасці. Метад і светапогляд мастака слова.

Рамантычны і рэалістычны тыпы творчасці пісьменніка.

Асноўныя мастацкія метады: класіцызм, сентыменталізм, рамантызм, рэалізм (крытычны, сацыялістычны).

Паняцце пра літаратурны напрамак. Літаратурныя напрамкі у межах аднаго мастацкага метаду, іх падабенства і адрозненне (пафас, галоўны герой). Натуралізм. Сімвалізм. Футурызм. Імажынізм.

Мастацкі стыль. Мнагазначнасць тэрміну. Стыль пісьменніка. Яго залежнасць ад метаду і напрамку, ад таленту, светапогляду і творчага вопыту мастака слова. Стылёвая плынь. Суаднесенасць стылю з мастацкім метадам (сентыментальны, рамантычны, рэалістычны стылі).

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «УВОДЗІНЫ Ў ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА» (дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа студэнтаў | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Форма кантролю заняткаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія ) заняткі | | | | |
| | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | **Уводзіны ў літаратуразнаўства** | **24** | **24** | **60** | | | |
| 1 | **Агульныя праблемы літаратуразнаўства** | **2** | **4** | **8** | | | |
| 1.1 | *Літаратуразнаўства як навука*<br>1. Асноўныя галіны літаратуразнаўства.<br>2. Паэтыка як літаратуразнаўчая дысцыпліна і як сістэма вобразнага адлюстравання свету.<br>3.Дапаможныя дысцыпліны літаратуразнаўства.<br>4. Сумежныя дысцыпліны літаратуразнаўства. | 1 | | 2 | Табліца «Асноўныя галіны і дапаможныя дысцыпліны літаратуразнаўства». | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[1]<br>[5]<br>[10] | |
| 1.2 | *Спецыфіка мастацкай літаратуры*<br>1. Паняцце аб прыгожым.<br>2. Прадмет літаратуры.<br>3. Месца літаратуры сярод іншых відаў мастацтва.<br>4. Асноўныя функцыі мастацкай літаратуры. | 1 | | 2 | Слайды «Жывапіс Беларусі».<br>Фотаздымкі сцэн са спектакляў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы («Хто смяецца апошнім», «Трыбунал», «Чорная панна Нясвіжа»). | Асн.:<br>[2]<br>[3]<br>Дад.:<br>[5]<br>[9]<br>[10] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.2.1 | *Мастацкі пераклад як від творчасці*<br>1. Паняцце пра мастацкі пераклад.<br>2. Віды мастацкага перакладу.<br>3.Супастаўленне мастацкага перакладу на іншыя мовы паэмы Якуба Коласа «Новая зямля».<br>4. Аналіз перакладаў на беларускую мову твораў А.С. Пушкіна. | | 2 | 2 | Пераклады на рускую, польскую, украінскую і англійскую мовы паэмы Я. Коласа «Новая зямля». Пераклады на беларускую мову твораў А.С. Пушкіна («Яўгеній Анегін», «Палтава» і інш.). | Асн.: [2]<br>Дад.: [4] | Франтальнае і індывідуальнае апытванне. Пісьмовая праца (мастацкі пераклад). |
| 1.3 | *Праблема аўтара*<br>1. Формы прысутнасці аўтара ў творы.<br>2.Паняцце пра лірычнага героя.<br>3. Уяўны апавядальнік.<br>4. Псіхалогія творчасці.<br>5. Перадумовы творчага працэсу.<br>6. Этапы творчага працэсу.<br>7. Творчая лабараторыя пісьменніка. | | 2 | 2 | Тэксты для аналізу | Асн.: [2]<br>Дад.: [5] | Франтальнае і індывідуальнае апытанне. Вусныя і пісьмовыя паведамленні. |
| 2 | **Літаратурны твор** | **8** | **10** | **26** | | | |
| 2.1 | *Цэласнасць і структура літаратурнага твора*<br>1.Паняцце аб літаратурным творы як аб сістэмна-цэласным адзінстве.<br>2. Катэгорыя формы і зместу твора.<br>3. Адзінства зместу і формы.<br>4. Паняцце аб змястоўнай форме. | 1 | | 4 | Табліцы «Тэкст», «Змест мастацкага твора», «Змест і форма». | Асн.: [2]<br>Дад.: [2] [5] [9] | |
| 2.2 | *Канцэптуальны ўзровень літаратурнага твора*<br>1. Віды тэм у дачыненні да рэальнасці.<br>2. Ідэя – асноўная абагульняльная думка ў творы.<br>3. Сукупнасць праблем і іх месца ў творы.<br>4. Пафас і яго віды. | 1 | | 4 | Табліцы «Тэмы», «Праблема», «Ідэя мастацкая». | Асн.: [2]<br>Дад.: [1] [5] | |
| 2.3 | *Узровень арганізацыі твора як мастацкага цэлага*<br>1. Сюжэт, яго віды.<br>2. Сюжэт і фабула. | 2 | | 4 | Табліцы «Форма мастацкага твора», Прынцыпы пабудовы сюжэта», «Канфлікт» | Асн.: [2] [3] [10] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Канфлікт – рухаючая сіла развіцця сюжэту.<br>4. Віды канфліктаў.<br>5. «Тэорыя бесканфліктнасці» ў літаратуры.<br>6. Кампазіцыя як спосаб арганізацыі мастацкага матэрыялу ў творы.<br>7. Паняцце пра архітэктоніку.<br>8. Пазасюжэтныя элементы ў кампазіцыі. | | | | | | |
| 2.3.1 | *Кампазіцыя і сюжэт эпічных і драматычных твораў.*<br>1. Аналіз кампазіцыі і сюжэту камедыі К.Крапівы «Хто смяецца апошнім».<br>2. Аналіз кампазіцыі і сюжэту аповесці В. Быкава «Знак бяды». | | 2 | | Табліца «Кампазіцыя літаратурнага твора». Тэксты камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» і аповесці В. Быкава «Знак бяды». | Асн.:<br>[2]<br>[3]<br>Дад.:<br>[4] | Аналіз твораў, гутарка па пытаннях |
| 2.4 | *Мастацкі свет літаратурнага твора (узровень «унутранай формы») і яго структура*<br>1. Мастацкі вобраз як форма адлюстравання рэчаіснасці мастацтвам.<br>2. Тэрміны «вобраз», «дзейная асоба», «персанаж», «герой», «характар», «тып», «архетып».<br>3. Тыпалогія персанажаў.<br>4. Праблема прататыпу.<br>5. Вымысел у мастацкай творчасці. | 2 | | 4 | Табліцы «Віды вобразаў-персанажаў», «Адносіны паміж персанажамі». | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>[3]<br>Дад.:<br>[3]<br>[5]<br>[10] | Падрыхтоўка рэфератаў |
| 2.4.1 | *Прыёмы стварэння характару (вобраза) ў мастацкім творы (на прыкладзе рамана І. Мележа «Людзі на балоце»)*<br>1. Партрэт.<br>2. Характарыстыка.<br>3. Інтэр'ер.<br>4. Паказ прыроды.<br>5. Мастацкая дэталь. | | 2 | 2 | Табліца «Прыёмы стварэння мастацкага вобраза чалавека». Тэкст рамана І. Мележа «Людзі на балоце». | Асн.:<br>[2]<br>Дад.:<br>[4]<br>[8]<br>[9] | Праца ў падгрупах. Літаратурны дыктант. |
| 2.5 | *Узровень знешняй формы мастацкага твора. Мова мастацкай літаратуры*<br>1. Народная мова, літаратурная мова, мова мастацкай літаратуры. | 2 | | 2 | Табліцы «Мастацкая мова (мова мастацкай літаратуры)», | Асн.:<br>[2]<br>Дад.:<br>[4] | Падрыхтоўка рэфератаў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Асноўныя функцыі мовы.<br>3. Тропы.<br>4. Простыя тропы (параўнанне, эпітэт).<br>5. Складаныя тропы (метафара, метанімія, сімвал, алегорыя, гіпербала, літота і інш.). | | | | «Тропы», «Слова (з пункту гледжання паходжання і сферы выкарыстання)». | [5] | |
| 2.5.1 | *Выкарыстанне слоўнікавага багацця народнай мовы*<br>1. Сінонімы. Антонімы. Амонімы. Эўфемізмы. Вульгарызмы. Дыялектызмы. Архаізмы. Гістарызмы. Неалагізмы. Наватворы. Макаранічная мова.<br>2. Праца з мастацкімі тэкстамі. | | 2 | 2 | Тэксты для аналізу | Асн.:<br>[2]<br>Дад.:<br>[3]<br>[5] | Складанне картатэкі |
| 2.5.2 | *Выкарыстанне тропаў у мастацкай літаратуры*<br>1. Эпітэт.<br>2. Метафара.<br>3. Метанімія.<br>4. Праца з мастацкімі тэкстамі. | | 2 | 2 | Тэксты для аналізу | Асн.:<br>[2]<br>Дад.:<br>[3]<br>[] | Конкурс на лепшы прыклад з мастацкай літаратуры. |
| 2.5.3 | *Паэтычны сінтаксіс. Фоніка*<br>1. Асноўныя сродкі паэтычнага сінтаксісу.<br>2. Паэтычная фанетыка (фоніка). | | 2 | 2 | Тэксты для аналізу | Асн.:<br>[2]<br>[5]<br>Дад.:<br>[3]<br>[5] | Рэйтынгавая кантрольная работа №1.<br><br>. |
| **3** | **Вершазнаўства** | **6** | **4** | **15** | | | |
| 3.1 | *Віды мастацкага слова*<br>1. Два віды мастацкага слова. Адрозненне паэзіі ад прозы.<br>2. Вершазнаўства як галіна літаратуразнаўчай навукі. Яго асноўныя раздзелы.<br>3. Структурна-змястоўнае адзінства верша.<br>4. Паняцці пра вершаваны рытм, метр, вершаваны памер. | 1 | | 3 | Камп’ютарная прэзентацыя «Вершаскладанне»<br>Тэксты для аналізу | Асн.:<br>[2]<br>Дад.:<br>[5]<br>[6] | |
| 3.2 | *Сістэмы вершаскладання* | 1 | | 3 | Камп’ютарная | Асн.: | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Антычнае вершаскладанне.<br>2. Сілабічная сістэма вершаскладання.<br>3. Танічная сістэма вершаскладання.<br>4. Сілаба-танічнае вершаскладанне. | | | | прэзентацыя «Вершаскланананне»<br>Тэксты для аналізу | [2]<br>Дад.:<br>[1]<br>[6] | |
| 3.3 | *Сілаба-танічнае вершаскладанне*<br>1. Паняцце пра памер і стапу і яе мадыфікацыі.<br>2. Вершаваны памер. Паўза. Клаўзула. Гукавыя паўторы.<br>3. Паняцце пра рыфму і яе віды (па складоваму саставу, па сугучнасці, па размяшчэнні ў радках страфы).<br>4. Рыфма канцавая, унутраная і пачатковая. Рэдкая, экзатычная. Банальная рыфма.<br>5. Спосабы рыфмоўкі. Белы верш.<br>6. Верлібр (свабодны верш). | 2 | | 3 | Камп'ютарная прэзентацыя «Сілаба-танічная сістэма вершаскладання».<br>Практыкум «Ад верша метрычнага да танічнага»<br>Тэксты для аналізу. | Асн.:<br>[2]<br>Дад.:<br>[6]<br>[8] | |
| 3.3.1 | *Асаблівасці сілаба-танічнага вершаскладання*<br>1. Стапа і вершаваны памер.<br>2. Рыфма.<br>3. Вызначэнне сілабатонікі ў мастацкіх творах. | | 2 | 2 | | Асн.:<br>[2]<br>Дад.:<br>[3]<br>[5]<br>[6] | Тэст |
| 3.4 | *Строфіка*<br>1. Строфіка як раздзел вершазнаўства і як сукупнасць строф.<br>2. Віды строф. Простыя віды: двухрадкоўі, трохрадкоўі і інш.<br>3. Класічныя (складаныя) віды строф: (ад шасці да шаснаццаці радкоў).<br>4. Цвёрдыя страфічныя формы (санет, трыялет, секстына, тэрцыны, актава, рандэль, рандо, анегінская страфа, хоку, танка і інш.).<br>5. Вянок санетаў. Вянок вянкоў санетаў.<br>6. Вольная страфа. | 2 | | 2 | Камп'ютарная прэзентацыя «Строфіка»<br>Тэксты для аналізу | Асн.:<br>[2]<br>Дад.:<br>[1]<br>[3]<br>[6] | Творчая работа. Напісанне ўласных вершаў у форме санета, трыялета, актавы, хоку, танка. |
| 3.4.1 | *Асаблівасці строф*<br>1. Спосабы ўтварэння, тыпалогія і класіфікацыя строф. | | 2 | 2 | Практыкум «Віды складаных строфаў. Класічныя віды | Асн.:<br>[2]<br>Дад.: | Аналіз вершаў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Цвёрдыя страфічныя формы.<br>3. Нетрадыцыйныя формы вершаў.<br>4. Пераходныя і змешаныя формы верша. | | | | строфаў». Тэксты для аналізу. | [1]<br>[3]<br>[6] | |
| **4** | **Літаратурныя роды, віды і жанры** | **4** | **4** | **6** | | | |
| 4.1 | *Літаратурныя роды*<br>1. Літаратурны спосаб вобразнага адлюстравання рэчаіснасці.<br>2. Тры роды мастацкай літаратуры: дыскусійнасць пытання. Узаемапранікненне эпасу, лірыкі і драмы.<br>3. Эпас як аповед пра мінулае, гістарычнае і міфалагічнае.<br>4. Паняцце пра лірычны род. Спецыфіка бессюжэтнай прозы.<br>5. Драматычны род і яго агульная характарыстыка.<br>6. Паэзія і проза: агульнае і падобнае. | 1 | | 2 | Табліцы «Роды і віды мастацкай літаратуры (спосабы вобразнага адлюстравання рэчаіснасці)», «Паэзія і проза: падабенства і адрозненне», «Формы адлюстравання рэчаіснасці».<br>Аўдыёзапіс сцэны са спектакля па п’есе К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» (даклад Гарлахвацкага). | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>[3]<br>Дад.:<br>[1]<br>[4]<br>[5]<br>[8] | |
| 4.2 | *Літаратурныя віды і жанры*<br>1. Паняцце пра літаратурны від як унутрыродавую і міжродавую катэгорыю.<br>2. Жанр як катэгорыя літаратуразнаўства.<br>3. Асноўныя літаратурныя віды і жанры.<br>4. Жанры і віды лірыкі.<br>5. Жанры эпасу.<br>6. Жанры драмы.<br>7. Ліра-эпічныя і ліра-драматычныя жанры. | 3 | 4 | 4 | Табліцы «Жанравыя формы», «Жанры змешанай формы (міжродавыя формы)», «Паэзія і проза: падабенства і адрозненне», «Формы адлюстравання рэчаіснасці».<br>Тэксты мастацкіх твораў розных жанраў. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>[3]<br>Дад.:<br>[5]<br>[8] | Складанне літаратуразнаў-чых слоўнікаў |
| **5** | **Літаратурны працэс** | **4** | **2** | **5** | | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5.1 | *Літаратурны працэс і яго асноўныя заканамернасці*<br>1. Паняцце пра літаратурны працэс. Заканамернасці літаратурна-мастацкага развіцця.<br>2. Традыцыі і наватарства.<br>3. Паняцце аб паскораным развіцці літаратуры.<br>4. Літаратурны працэс на Беларусі. | 1 | | 2 | Схема «Асноўныя перыяды літаратурнага працэсу». | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>Дад.:<br>[2]<br>[9] | |
| 5.2 | *Мастацкі метад і стыль. Літаратурны напрамак*<br>1.Паняцце аб мастацкім стылі.<br>2. Метад, напрамак, школа.<br>3. Асноўныя мастацкія метады (класіцызм, сентыменталізм,рамантызм, рэалізм). | 3 | 2 | 3 | Табліцы «Мастацкі метад», «Асноўныя метады», «Асноўныя напрамкі еўрапейскай літаратуры». Рэпрадукацыі твораў жывапісу: «Групавы партрэт» І. Аляшкевіча, «Стары кравец» Ю. Пэна, «Партрэт А. Міцкевіча», І. Аляшкевіча, «Салдат першай дывізіі» К. Малевіча. | Асн.:<br>[1]<br>[2]<br>[3]<br>Дад.:<br>[2]<br>[7]<br>[8] | Падрыхтоўка прэзентацый. Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |
